Справаздача 2025

# Новы Іншы Я

# ЗМЕСТ


**Вітальнае слова** 3

***Самае галоўнае — дзякуй!*** 5

**Хто такія ІншыЯ** 6

**Наша каманда** 9

**«Іншыя» лічбы і факты** 18

**Што мы робім** 20

***Асвета моладзі ў галіне недыскрымінацыі і інклюзіі*** 21

*Лічбы і факты* 22

*Мікра-медыя theothersby.org* 24

*ІншыКвіз* 26

*Рассылка «Што новага?»* 27

*Інфакампанія «Усіх падтрымліваць, нікога не прыгнятаць»* 28

*Чэк-лісты для арганізатар_ак* 29

***Адукацыя моладзі і медыя ў галіне недыскрымінацыі і інклюзіі*** 30

*Лічбы і факты* 31

*Курс «Рабі смела!» Living library edition* 32

*Трэнінгі для актывіст_ак і кантэнт-мэйкер_ак* 36

***Сумесныя дзеянні па фармаванні культуры недыскрымінацыі і інклюзіі*** 41

*Лічбы і факты* 42

*«Роўны Сакавік»* 43

*Развіццё сувязяў паміж грамадскім сектарам і медыя* 48

*Развіццё лакальнай супольнасці ў Вільнюсе* 52

***Арганізацыйнае развіццё*** 54

**Планы на 2026 год** 55

**Як нас падтрымаць** 58

**Як з намі звязацца** 62

# ВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

2025 год быў няпростым і выпрабоўваў нас з самых першых дзён. Змяншэнне фінансавання прымусіла скараціць аб’ёмы дзейнасці *(але не колькасць працы!)*, перабудаваць каманду і распрацаваць новую стратэгію на 3 гады.

Мы і раней шмат працавалі для беларускай моладзі, але ў 2025 годзе вырашылі, што засяродзім усю сваю ўвагу менавіта на гэтым кірунку ў найбліжэйшыя тры гады.

Нямала часу ў 2025 годзе давялося вылучыць на пошук фінансаў для працы, які, на жаль, даволі рэдка завяршаўся станоўчым адказам. Наш сайт атрымаў блакіроўку ад Раскамнагляду *(то-бок карысталь_ніцы ў Расіі ўжо не могуць карыстацца сайтам без VPN)*, а канал у Тэлеграме зрабіўся «экстрэмісцкімі матэрыяламі». Складанасцяў было нямала.

Але мы працавалі і будзем працаваць далей, пераадольваючы ўсе перашкоды. Бо **мы любім тое, што робім, і верым у гэта!**

Мы ганарымся вынікамі нашай дзейнасці ў 2025 годзе і вельмі радыя падзяліцца гэтым з вамі!



# Самае галоўнае — дзякуй!



У 2025 годзе мы традыцыйна працавалі ў партнёрстве з нашымі аднадумцамі: актывіст_камі, журналіст_камі і эксперт_камі, а таксама з арганізацыямі і ініцыятывамі з блізкімі нам каштоўнасцямі. Вялікі дзякуй усім нашым партнёр_кам за крутыя сумесныя допісы, артыкулы, кампаніі, мерапрыемствы і нават цэлыя праекты! **Нашая агульная дзейнасць матывуе нас працаваць далей! Шкада, што з розных прычын мы не можам згадаць усіх вас у гэтай справаздачы.**

Асобны дзякуй хочам сказаць нашым чытач_кам, падпісчы_цам і ўдзель_ніцам мерапрыемстваў! Вашая падтрымка і актыўнасць натхняе нас на новыя ідэі і праекты.

# ХТО
# ТАКІЯ
# ІНШЫЯ

**ІншыЯ** — беларуская моладзевая арганізацыя,
заснаваная **4 сакавіка 2022 году**,
якая працуе для Беларусі і моладзі Беларусі,
і складаецца з маладых беларус_ак,
якія вымушана жывуць у розных краінах

# Місія

Фармуем культуру роўнасці, разнастайнасці і інклюзіі сярод беларускай моладзі

# Каштоўнасці

- Інклюзіўнасць
- Роўнасць і недыскрымінацыя
- Гендарная роўнасць
- Беларуская мова і ідэнтычнасць
- Экапрыязнасць

# Кірункі дзейнасці

- Асвета моладзі ў галіне недыскрымінацыі і інклюзіі
- Адукацыя моладзі і медыя ў галіне недыскрымінацыі і інклюзіі
- Сумесныя дзеянні па фармаванні культуры недыскрымінацыі і інклюзіі
- Арганізацыйнае развіццё

# НАША КАМАНДА

# Цяпер у асноўнай камандзе ІншыЯ

**15** чалавек

**4**

партнёр_кі

ядро каманды, якое адказвае за фармуляванне і дасягненне мэтаў і задач

**11**

прыхіль_ніц

людзі, якія дапамагаюць арганізацыі дасягаць пастаўленых мэтаў і задач

# У пашыраную каманду ўваходзіць яшчэ 19 чалавек

## 7

### валанцёр_ак

стварающь афішы для мерапрыемстваў, дапамагаюць з арганізацыяй афлайн-падзей, займаюцца візуальным афармленнем артыкулаў, перакладаюць тэксты і інш.

## 10

### журналіст_ак

пішуць крутыя тэксты для нашага медыя

## 2

### спецыяліст_кі

дапамагаюць нашым тэкстам ззяць

# Вы таксама можаце стаць часткай ІншыЯ!

ЗАПОЎНІЦЬ ФОРМУ

Запоўніце форму і станьце часткай валанцёрскай каманды,
каб разам з намі рабіць гэты свет больш інклюзіўным!

# Давайце пазнаёмімся трошкі бліжэй з асноўнай камандай!

Для нас каманда — гэта значна больш, чым проста спіс людзей. Гэта Магічны Ордэн аднадумцаў, дзе кожны голас важны, а кожная суперсіла — унікальная. Мы правялі ўнутранае апытанне, падчас якога каманда міжсобку прызначыла магічныя тытулы.

Гэтыя намінацыі напоўненыя цёплым гумарам, павагай і глыбокай удзячнасцю — такім чынам адлюстроўваюць наш унутраны вайб. Запрашаем вас пазнаёміцца з тымі, хто ўваходзіць у наш Магічны Ордэн і стварае будучыню нашай арганізацыі



## Воля

**Уладарачка Словаў**

Вандруе схаванымі сцежкамі Беларусі і стварае найлепшыя гісторыі



## Ганна

**Іскра Будычыні**

Тэлезорка, якая валодае Магіяй Смелых крокаў і з’яўляецца дэбютам у рэальнасці



## Віка

**Муза Нязгаснай Энергіі**

Натхняе Новыя Сэрцы, валодае Магіяй «Любога Варушняку» і здольная ператварыць кожную іскру ў вялікае полымя



## Арыша

**Багіня Распаўсюду**

Ёга-Дзіва, якая валодае дыханнем арганізацыі, яднае сэрцы і заўсёды застаецца на сувязі



## Марына

**Праджэкт-Каралева
і Сэрца Каманды**

Уладарка Залатых Кудзеркаў, якая трымае шчыт магутнай абароны і кіруе плынямі шматзадачнасці



## Даша

**Фея Крыштальнай
Структуры**

Багіня Табліц і Кіндарсюрпрызаў, якая валодае Магіяй дэталяў і каардынацыі



## Саша

**Гештальт-Архітэктарка
Візуальных Сэнсаў**

Амбасадарка Шчырасці, якая лечыць праекты ад хаосу, ахоўвае спакой каманды



## Дзіма

**Вярхоўны Стратэг
і Мультыінструменталіст Сэнсаў**

Кіруе плынямі будучыні і ніколі не спыняе рух, нават калі ўласнае полымя патрабуе адпачынку



## Жэня

### Архітэктарка Тэкстаў і Сэнсаў

Захоўвае пісьмовы код, валодае Магіяй чуллівасці і аберагае жывых істот



## Каця

### Прынцэса Сторызаў і Допісаў

Валодае Магіяй нязломнага пазітыву і носіць тытул Залатой Студэнткі Ордэна



## Лёша

### Чараўнік Ахопаў

Робіць нябачнае бачным для ўсіх, трымае раўнавагу праз Магію чыстага ratio



## ЮЮ

### Захавальніца Моўнай Магіі

Валодае Дарам бязмежнай уважлівасці да Стыхіі слова



## Дзіма Л.

### Лічбавы Алхімік
### і Магнат Табліц

Праз церні вандровак здабывае
Магію выплатаў і дорыць бясконцы
ўтульны камфорт



## Сяргей

### Уладар Залатога
### Мантажнага Пальца

Крэатыўны фанат Кракаўскіх Сцежак,
які стварае кантэнт нават у часы
вялікага супакою



## Ганна

### Жывая Сіла
### Зменаў

Адкрыццё Году, валодае Магіяй
хуткасці, структурнай моцай
і Смелым голасам

# «ІНШЫЯ» ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**14 960** паведамленняў у Slack ✱ *гэта ў сярэднім 59 паведамленняў на дзень!*

**5** краін, у якіх жыве каманда

**∞** колькасць клопату і любові

**1 730+** еўра данатаў

**8** рэалізаваных праектаў

**1** новы офіс

**1** партыя ў D&D

**16** новых заявак на валанцёрства

**30+** міжнародных і сектарных падзей наведала каманда

# ШТО МЫ РОБІМ

# **асвета** моладзі ў галіне НЕДЫСКРЫМІНАЦЫІ І ІНКЛЮЗІІ

# ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

# 1

«экстрэмісцкі» канал
у Тэлеграме

блакіроўка
ад Раскамнагляду

новы канал
у TikTok

Green Awards Belarus
за «Лепшы экакантэнт
у сацсетках»

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**92 000+** праглядаў сайту

**24** выпускі рассылкі «Што новага?»

**5100+** падпісант_ак у сацсетках

**81** новы артыкул на сайце *✱ у 1,5 раза больш, чым у 2024*

**83** пытанні ў квізах

**1 276 000+** ахопаў матэрыялаў у сацсетках *✱ у 1,7 раза больш, чым у 2024*

# МІКРА-МЕДЫЯ THEOTHERSBY.ORG

Мы ствараем медыя пра інклюзію на беларускай мове, якое дае голас уразлівым групам, асвятляе праблемы дыскрымінацыі і стварае прастору для натхнення і падтрымкі. Мы тлумачым каштоўнасці роўнасці і інклюзіі простай мовай — праз асабісты досвед, практычныя парады і кантэнт, зразумелы кожна_й.

За год мы распавялі **больш за 30 гісторый** прадстаў_ніц уразлівых груп, сярод якіх жанчыны, людзі з ВІЧ, ЛГБТК+-персоны, палітвязні, нейраатыповыя і невідушчыя людзі і інш.

Нашыя матэрыялы передрукоўвалі такія медыя, як Салідарнасць і Еўрарадыё, дзякуючы якім гісторыі людзей і іншыя важныя тэмы пабачыла яшчэ больш чытач_ак!



МІКРА-МЕДЫЯ THEOTHERSBY.ORG

# Самыя папулярныя матэрыялы 2025 году

1. Мізагінны слюр: незаўважная нянавісць да жанчын
2. «Навязваюць свой лад жыцця» і яшчэ пяць міфаў пра вегана к
3. У Беларусі прыняты новы закон аб адказным абыходжанні з жывёламі. Разбіраемся, што з ім не так
4. «Мы — не нашыя дыягназы»: Лея — пра жыццё з памежным разладам асобы
5. Чаму засцерагацца — усё яшчэ «жаночая справа»?



# ІНШЫКВІЗ

Летась мы паспяхова рэалізавалі новы фармат — **першы цалкам беларуска-моўны квіз на YouTube пра роўнасць і недыскрымінацыю.** Ён стаў не проста забавай, а спосабам гаварыць пра важныя тэмы праз гульню і інтэрактыў. У квізе вы даведаецеся пра натхняльных жанчын-зорак, якія па-за межамі асноўнай працы займаюцца актывізмам. А таксама мы разам звернемся да каранёў сэксізму і разбяромся з нечаканымі стэрэатыпамі.




# Цікавыя факты

Выйшлі
2 выпускі

Праведзены
1 эксклюзіўны
афлайн-івэнт
у Вільнюсе

Адзін з раўндаў першага квізу быў падрыхтаваны медыя-ініцыятывай «Гэта Окей»

## ДЗЕ ГЛЯДЗЕЦЬ?

поўныя выпускі, атмасферныя спаборніцтвы і эмоцыі

самыя яскравыя моманты, тлумачэнне адказаў, бонусныя пытанні

# РАССЫЛКА «ШТО НОВАГА?»

У чэрвені 2025 праз складанасці з фінансаваннем мы спынілі выпуск нашага штомесячнага дайджэсту, у якім асвятлялі важныя навіны ў галіне правоў чалавека, інклюзіі, гендарнай роўнасці і экапрыязнасці.

Аднак мы не спынілі працу! Мы змянілі фармат рассылкі, і цяпер штомесяц вы можаце атрымаць усе новыя артыкулы і анонсы «Іншых» адным лістом.

**АФОРМІЦЬ ПАДПІСКУ***

*гэта бясплатна

**ЧЫТАЦЬ ДАЙДЖЭСТЫ**

за 2025 год

## ІНФАКАМПАНІЯ «УСІХ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ, НІКОГА НЕ ПРЫГНЯТАЦЬ»

У траўні 2025 году мы разам з медыя-ініцыятывай «Гэта Окей» зладзілі інфармацыйную кампанію з нагоды 17 траўня — Міжнароднага дня барацьбы з гамафобіяй, трансфобіяй і біфобіяй. У межах кампаніі мы не толькі распаўсюджвалі інфармацыйныя допісы, а таксама запрашалі беларускія бары і кавярні ў розных краінах рабіць тэматычныя сэты, express кактэйлі ці стравы. Частка грошай з кожнай такой пакупкі ішла на падтрымку ЛГБТК+-персон у крызісных абставінах у Беларусі.




### Да кампаніі далучыліся

MY pod sceną
(Познань)

Karma
(Варшава)

SHISHA PUB
(Катавіцы)

Карчма 1863
(Вільнюс)

### Медыя-парнёр кампаніі

KYKY.ORG
партал

# ЧЭК-ЛІСТЫ ДЛЯ АРГАНІЗАТАР_АК

Мы стварылі на сайце бібліятэку карысных матэрыялаў пра скразныя каштоўнасці, каб уся гэтая інфармацыя заўсёды была ў вас пад рукой. Такім чынам, у адным месцы мы сабралі матэрыялы пра правы чалавека, інклюзію, гендарную роўнасць і экапрыязнасць. Карыстайцеся!

**«Як ладзіць мерапрыемствы для людзей з ПТСР»**

**«Стварэнне інклюзіўнай прасторы для нейраатыповых людзей»**

**«Як арганізаваць kids-friendly прастору на мерапрыемстве»**



Чэк-ліст
«Як ладзіць мерапрыемствы для людзей з посттраўматычным сіндромам (ПТСР)»

Фарматы працы на мерапрыемствах

- Індывідуальныя мерапрыемствы або праца ў малых групах
- Дыхальныя тэхнікі, медытацыя або рэлаксацыя
- Працатэрапія
- Мерапрыемствы на прыродзе і фізічная актыўнасць

Падрыхтоўка

1. **Форма рэгістрацыі** Спытаць будучых удзель_ніц пра іх асаблівыя патрэбы.
2. **Анонс** Папярэдзіць удзель_ніц пра фармат мерапрыемства і прапісаць трыгерныя папярэджанні.
3. **Бяспека і камфорт** На мерапрыемстве неабходна стварыць бяспечную прастору, то-бок прастору, дзе ёсць правілы камунікацыі і паводзін.

Правядзенне

1. **Уважлівасць** Назіраць за паводзінамі ўдзель_ніц, адсочваць змены ў іх стане.
2. **Гнуткасць** Трэба быць гатовымі мяняць фармат дзейнасці зыходзячы з бягучай сітуацыі і зменаў у паводзінах/стане ўдзель_ніц.
3. **Перапынак** Наяўнасць зоны адпачынку і/або ціхага пакою для адпачынку.

Вельмі важна, каб удзель_ніцы бавілі час за заняткамі, якія ім падабаюцца і прыносяць задавальненне, дапамагаюць ім адчуваць сябе ў бяспецы і наладжваць зносіны з іншымі людзьмі.

Чэк-ліст распрацаваны паводле артыкула Марыйкі Арловай «Як ладзіць мерапрыемствы для людзей з посттраўматычным сіндромам», з якога можна больш даведацца пра ПТСР і падрыхтоўку мерапрыемстваў для людзей з такім сіндромам.

Хочаце дадаць у бібліятэку матэрыял, якога тут яшчэ няма? Напішыце нам на пошту

**info@theothersby.org**

і ён хутка з’явіцца ў бібліятэцы!



Чэк-ліст
«Стварэнне інклюзіўнай прасторы для нейраатыповых людзей»
Ключавыя фактары і як іх улічваць пры стварэнні інклюзіўнай прасторы

1. **Ясная камунікацыя**
   - Дакладныя фармулёўкі
   - Наглядныя дапаможнікі, візуальна прадстаўляючыя інфармацыю
   - Альтэрнатыўныя формы камунікацыі
2. **Улік сэнсарных асаблівасцяў**
   - Мінімізацыя непатрэбнага шуму, яскравага асвятлення або залішніх раздражняльнікаў
   - Асобны ціхі пакой
3. **Фізічная даступнасць**
   - Адаптыўнае абсталяванне і інфраструктура: пад’ёмнікі,

**адукацыя** моладзі і медыя ў галіне

# НЕДЫСКРЫМІНАЦЫІ І ІНКЛЮЗІІ

**3**

мерапрыемствы

**41**

удзельні_ца

**>80%** удзельні_ц атрымалі новыя веды

**>60%** удзельні_ц ужо прымяняюць веды на практыцы

**100%** удзельні_ц гатовыя рэкамендаваць нашы мерапрыемствы іншым

## КУРС «РАБІ СМЕЛА!» LIVING LIBRARY EDITION

Курс распрацаваны для маладых беларус_ак, якія жывуць у Вільнюсе і жадаюць далучыцца да актывізму. Мы запусцілі гэты курс увосень 2025 году і на працягу трох месяцаў навучалі ўдзель_ніц метадам барацьбы са стэрэатыпамі і дыскрымінацыяй праз фармат **«Жывая Бібліятэка»**.

12 удзель_ніц прайшлі шлях ад вывучэння тэорыі праектнага цыклу на афлайн-трэнінгах да самастойнай арганізацыі мерапрыемстваў з ментарскай падтрымкай ад нашай каманды.





# Вынікі курсу

Галоўны вынік — выпуск_ніцы курсу самастойна правялі дзве «Жывыя Бібліятэкі», якія наведалі

**55** **чытач_ак,** у якіх узялі ўдзел **13** **«жывых кніг»**

**100%** удзель_ніц адзначылі карыснасць курсу для асабістага развіцця і самарэалі-зацыі. Цяпер удзель_ніцы «не панікуюць перад вялікімі задачамі» і разумеюць, як ператварыць ідэю ў гатовы праект

**75%** удзель_ніц гатовыя працягваць рабіць «Жывыя Бібліятэкі» ў Вільнюсе

Асобна ўдзель_ніцы вылучылі **стварэнне «неверагодна камфортнай атмасферы»**: шмат для каго курс стаў бяспечнай прасторай, дзе можна памыляцца і атрымліваць падтрымку

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Праграма дапамагла знайсці аднадумцаў і стварыць камфортнае, бяспечнае асяроддзе для працы на працягу курсу. У выніку мы атрымалі рэальны досвед планавання і правядзення мерапрыемстваў на ўсіх этапах, а таксама магчымасць далей развіваць гэты гатовы праект і ствараць нешта сваё на падставе атрыманых ведаў і дапамогі!

**Алекс**
актывіст і візуальны мастак
23 гады

За ўвесь курс мне падрабязна патлумачылі, што і як трэба рабіць для правядзення Жывой Бібліятэкі і ў цэлым для таго, каб зрабіць які-кольвек праект. Я адчувала велізарную падтрымку ад ментар_ак курсу і іх уключанасць у працэс. Я бачу класныя вынікі нашай працы, і без гэтага курсу нічога б не атрымалася

**Аня**
16 гадоў

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Супер раю дадзеную праграму! Яна не проста пра тое, як праводзіць Жывыя Бібліятэкі. Яна пра знаходжанне новых сяброў, засваенне навыку працы ў камандзе, кучу новых эмоцый і дасягненне пастаўленых мэтаў. Праграма таксама дапамагла даведацца нешта новае і паглядзець на многія рэчы зусім пад іншым вуглом

Праграма дапамагла сабраць інфармацыю пра планаванне і падрыхтоўку мерапрыемстваў у зразумелую структуру і на практыцы паглядзець, як гэта ўсё працуе. Да таго ж не ў нейкіх ідэальных умовах, а ў самых звычайных, са сваімі цяжкасцямі, пры гэтым арганізатар_кі падтрымлівалі на ўсіх этапах, што было вельмі каштоўна

Праграма выдатная! Спагадлівыя арганізатары, цікавы матэрыял, практычны досвед. Усё гэта дапамагло даць добры старт для пачатку свайго ўласнага праекту

# ТРЭНІНГІ ДЛЯ АКТЫВІСТ_АК І КАНТЭНТ-МЭЙКЕР_АК

У 2025 годзе сумесна з нашымі партнёрамі з аб’яднання беларус_ак Германіі Razam e.V мы працягвалі працу па збліжэнні беларускіх медыя і грамадзянскай супольнасці. Адным з кірункаў было стварэнне адукацыйных прадуктаў, якія дапамаглі б гэтым дзвюм супольнасцям паразумецца яшчэ лепш. Усё гэта рэалізоўвалася ў межах праекту **«Together for Values — JA»**.

У красавіку 2025 года ў Вільнюсе мы правялі **трэнінг для НДА па распрацоўцы камунікацыйных стратэгій**.

16 удзель_ніц не толькі падумалі пра сваё пазіцыянаванне ў інфармацыйнай прасторы, але і даведаліся, як правільна ўзаемадзейнічаць з рознымі стэйкхолдэрамі, у тым ліку з медыя. Пасля афлайн-інтэнсіву 6 удзель_ніц працягнулі працу з ментарам над стварэннем або паляпшэннем сваёй медыя-стратэгіі.

## Галоўны вынік трэнінгу — 81% удзель_ніц змянілі свой падыход да фармулявання камунікацыйнай стратэгіі

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Шчыра дзякую за трэнінг! Я прыйшла на яго ўвогуле без уяўлення, што такое камунікацыйная стратэгія, а выходжу з матэрыяламі і ведамі, якія магу выкарыстаць на практыцы для розных праблем маёй арганізацыі. Хоць я і працую з маркетынгам, але часам ён падаецца велізарным монстрам. З дапамогай трэнінгу я зразумела, што трэба ставіць невялікія задачы для вырашэння агульнай праблемы ў маёй працы. Таксама вельмі ўдзячна за тое, як структураваная інфармацыя і што яе можна выкарыстоўваць літаральна кожны дзень. 10/10, усім раю!

**М. Зелянок**
менеджарка сацсетак у НДА
20 гадоў

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Я з задавальненнем магу парэкамендаваць гэты трэнінг. Я прайшоў яго сам, атрымаў карысныя інструменты і інструкцыі для стварэння ўласных стратэгій. Гэта стала карысным для нашай арганізацыі і палепшыла мэтавыя паказнікі ўзаемадзеяння з аўдыторыяй

**Вячаслаў**
праектны дырэктар

Лёгкая падача складанай тэорыі, цікавыя прыклады з нашай рэчаіснасці. Хочацца зразумець сваю аўдыторыю яшчэ лепш, каб яшчэ лепш з ёю працаваць, даносіць свае мэсыджы праз тое, што важна аўдыторыі

**Ніна**
падтрымка жаночых суполак
38 гадоў

У кастрычніку 2025 году ў Вільнюсе мы правялі варкшоп **«Інклюзіўныя тэксты: Як пісаць пра ўразлівыя групы так, каб нікому не нашкодзіць»**. 13 стварaль_ніц кантэнту з медыя і НДА разабраліся ў асаблівасцях працы з уразлівымі групамі праз розныя інтэрактыўныя фарматы.

## Галоўны вынік варкшопу — 91% удзель_ніц змянілі сваё ўяўленне пра тое, як ствараць кантэнт пра ўразлівыя групы

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Варкшоп быў вельмі карысны з прафесійнага пункту гледжання: ён даў інструменты і прыклады таго, як рабіць кантэнт больш інклюзіўным і адказным. Асабліва спадабалася, што тэорыя спалучалася з практыкай і дыскусіямі. Рэкамендую ўсім, хто працуе з публічным словам або медыя

**Воля Новік**
блогерка і крэатарка
відэакантэнту

Я думаю, што гэты варкшоп павінен быць арганізаваны шмат разоў — для педагогаў, прадпрымальнікаў, рэдакцый розных выданняў і г.д. Усё гэта неабходна для Новай Беларусі

**Удзель_ніца варкшопу**

Мне здаецца, што люб:ая журналіст:ка павінны прайсці такі курс для таго, каб зрабіць нашыя медыя больш якаснымі і глыбокімі

**Удзель_ніца варкшопу**

**сумесныя дзеянні** па фармаванні культуры

# НЕДЫСКРЫМІНАЦЫІ І ІНКЛЮЗІІ

# ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**50** мерапрыемстваў на **600+** удзель_ніц, з якіх

**43** афлайн

**42** за мяжой

**4** краіны

**7** афлайн

**8** у Беларусі

**7** гарадоў

**ІншыЯ**

**9** мерапрыемстваў

**70+** удзель_ніц

**Партнёрскія**

**41** мерапрыемства

**530+** удзель_ніц

# «РОЎНЫ САКАВІК»

У 2025 годзе разам з Human Constanta мы ўпершыню аб’ядналі намаганні для правядзення маштабнага месяца роўнасці, недыскрымінацыі і інклюзіі **«Роўны Сакавік»**.

Мы выкарысталі формулу **«Тыдзень + Тыдзень = Месяц»**, бо праект узнік праз зліццё дзвюх ініцыятыў: Тыдня нулявой дыскрымінацыі (які «ІншыЯ» ладзяць з 2021 году) і Тыдня за роўнасць і інклюзію ў межах кампаніі **«Розныя-Роўныя»** (які Human Constanta ладзіць з 2016 года). Гэта дазволіла нам стварыць бесперапынную серыю актыўнасцяў з 1 па 31 сакавіка і ахапіць важныя міжнародныя даты: ад Дня нулявой дыскрымінацыі да Дня барацьбы за ліквідацыю расавай дыскрымінацыі.

# «РОЎНЫ САКАВІК»

**111 000+** праглядаў сайту

**25** мерапрыемстваў

**24** партнёр_кі Месяца

**307** удзель_ніц

**97%** удзель_ніц атрымалі новыя веды па тэме недыскрымінацыі

**95%** удзель_ніц задумаліся пра сваё стаўленне да ўразлівых груп

# У межах Месяца мы апублікавалі серыю важных матэрыялаў

1. Звычайны эйджызм: як абясцэньваюцца амбіцыі і досвед людзей 40+
2. Ці не трапляеце вы ў пастку стэрэатыпаў, віншуючы з 8 Сакавіка — тэст
3. «Не проста моцныя эмоцыі». Як бачаць свет людзі з памежным разладам асобы?
4. Разбураючы стыгму: месячныя як саюзнік і частка спартовай стратэгіі
5. Чаму засцерагацца — усё яшчэ «жаночая справа»?



«РОЎНЫ САКАВІК»

# Што ўдзель_ніцам было найбольш цікава абмяркоўваць на працягу мерапрыемстваў?

Як мы можам кожны дзень уплываць і змяняць меркаванне грамадскасці праз свой асабісты прыклад у жыцці. І тое, як ёга дапамагае з прыняццем сябе і праз гэта прыняццем іншых людзей (нежаданнем канфліктаў)

Удзель_ніца мерапрыемства,18-25 гадоў
**«В гармонии с собой: йога и путь к равенству»**
ад **Future_Lt**

Мне было цікава ўсё, але асабліва цікава было тое, што калажы можна зрабіць з палітычным кантэкстам!

Удзель_ніца калажнага варкшопу, 26-35 гадоў
**«Манифестация против дискриминации»**
ад **biz.by.queers**

# Што ўдзель_ніцам было найбольш цікава абмяркоўваць на працягу мерапрыемстваў?

Даведацца гісторыю таго, як мянялася прапаганда і яе ўплыў у Беларусі з 1990 году да цяперашняга часу

Удзель_ніца мерапрыемства, 26-35 гадоў
**«Если ты не занимаешься политикой — она займётся тобой»** ад **Маладая Грамада**

Вельмі цікавыя кейсы! Нават не ведала, што ШІ так моцна можа ўплываць на дзяржаўныя практыкі

Удзель_ніца варкшопу, 26-35 гадоў
**«Правы чалавека і Штучны інтэлект»**
ад **ІншыЯ**

Роля і роўны ўдзел жанчын у рэалізацыі сваіх правоў і магчымасцяў. Наколькі ў сучасным грамадстве яшчэ існуе ўплыў мужчын пры ўладкаванні на працу

Удзель_ніца мерапрыемства, 35+ гадоў
**«Синдром самозванки»**

# РАЗВІЦЦЁ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ ГРАМАДСКІМ СЕКТАРАМ І МЕДЫЯ

У мінулым годзе мы завяршылі рэалізацыю двухгадовага праекту **«Together for Values — JA»** сумесна з Razam e.V. і «Журналісты за талерантнасць». Праект быў скіраваны на аднаўленне разбураных сувязяў паміж грамадскім сектарам і медыя і павышэнне прысутнасці важных тэмаў і ўразлівых груп у медыя.

## Што было зроблена ў 2025 годзе?

- **5 нэтворкінгаў** паміж НДА і медыя
- **Медыяхакатон** «Пра Людзей»
- **3 study tour** у Берлін
- **Даследаванне** пра супрацоўніцтва медыя і НДА
- **Варкшоп** для журналіст_ак «Інклюзіўная журналістыка: Як пісаць пра ўразлівыя групы так, каб нікому не нашкодзіць»
- **Трэнінг і ментарства** для НДА па распрацоўцы камунікацыйных стратэгій



# РАЗВІЦЦЁ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ ГРАМАДСКІМ СЕКТАРАМ І МЕДЫЯ

**175 чалавек**
узялі ўдзел
у мерапрыемствах

**60% удзель_ніц**
нэтворкінгаў плануюць
супрацоўніцтва з новымі
кантактамі

**50+ матэрыялаў**
выйшла ў медыя
пасля хакатону

**100% удзель_ніц**
адукацыйных фарматаў плануюць
выкарыстоўваць атрыманыя веды
на практыцы

**6 арганізацый**
атрымалі кансультацыі
і склалі планы паляпшэння
публічнай камунікацыі

**356 000+** ахопаў матэрыялаў
у медыя пасля хакатону

# Як свой досвед апісваюць самі ўдзель_ніцы

Дзякуй за ўтульную атмасферу і магчымасць знаёміцца і размаўляць

**Удзель_ніца нэтворкінгу**

Было вельмі камфортна і атрымалася неяк натуральна, а не штучна пазнаёміцца з людзьмі. Дзякуй

**Удзель_ніца нэтворкінгу**

Вельмі карысны праект. Я атрымала карысную інфармацыю і палепшыла разуменне, як ладзіць супрацу з медыя. Калі будуць падобныя праекты ў будучыні, буду імкнуцца браць удзел

**Удзель_ніца медыяхакатону**

Гэта быў вельмі карысны досвед узаемадзеяння. Мне было важна абмеркаваць многія пытанні з прадстаўнікамі СМІ і зразумець прынцыпы і метады іх працы, а таксама самастойна прапанаваць тэмы для асвятлення, якія найбольш цікавяць нашую супольнасць

**Удзель_ніца медыяхакатону**

# РАЗВІЦЦЁ СУВЯЗЯЎ ПАМІЖ ГРАМАДСКІМ СЕКТАРАМ І МЕДЫЯ

У жніўні-верасні 2025 года сумесна з Razam e.V. пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі журналістаў мы зладзілі даследаванне **«Як (не) супрацоўнічаюць медыя і арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС): патрэбы, механізмы і прычыны»**.

**14** глыбінных інтэрв'ю

**70** адказаў на анлайн-анкету

**55%** апытаных АГС супрацоўнічаюць з медыя толькі ў асобных выпадках

**57%** апытаных медыя рэгулярна ці стала маюць супольныя справы з АГС

**30%** АГС і медыя задаволеныя бягучай сітуацыяй

**>70%** АГС і медыя зацікаўленыя ў развіцці супрацоўніцтва паміж медыя і АГС

Таксама даследаванне ўтрымлівае карысныя парады пра паляпшэнне супрацоўніцтва.

АРТЫКУЛ НА САЙЦЕ

ПОЎНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

# РАЗВІЦЦЁ ЛАКАЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ВІЛЬНЮСЕ



**У 2025 годзе мы надавалі ўвагу працы з беларус_камі ў Вільнюсе.** Для таго, каб людзі маглі ўсталёўваць новыя сувязі і падтрымліваць адны адных, мы правялілі **11 мерапрыемстваў,** якія наведала больш за **100 чалавек.**

Разам мы знаёміліся на беларускамоўных нэтворкінгах, гулялі ў квіз, стваралі калажы і рыхтавалі мапу жаданняў на 2026 год.

# РАЗВІЦЦЁ ЛАКАЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ВІЛЬНЮСЕ

Напрыканцы 2025 году ў партнёрстве з ініцыятывай Свядомы шык мы зладзілі своп-вечарыну **«Антычорная пятніца»**. На ёй людзі мяняліся рэчамі, якія ім больш не патрэбныя, каб даць ім новае жыццё ў іншых руках. Больш за 20 чалавек прынеслі і/ці забралі з сабой адзенне, абутак, кнігі, касметыку і іншыя рэчы.

Таксама мы працягвалі напаўняць анонсамі наш Тэлеграм-канал

**Іншы Вільнюс**

Далучайцеся, каб сачыць за лакальнымі падзеямі!

@OTHERVILNIUS







# Развіццё і ўмацаванне патэнцыялу арганізацыі заўжды важны для нас кірунак працы. У 2025 годзе мы змаглі:

* сустрэцца камандай для абмеркавання стратэгіі працы да 2028 году
* ацаніць патрэбы каманды, каб улічваць іх у працы
* перазапусціць працу з валанцёр камі
* стварыць і абнавіць шмат важных дакументаў: пратаколы бяспекі, праца з антывыгараннем каманды, медыя-стратэгія на 2 гады, працэсы маніторынгу і ацэнкі

# ПЛАНЫ НА 2026 ГОД

# Нягледзячы на ўсе складанасці, з якімі мы сутыкаемся, у тым ліку недахоп фінансавання на 2026 год, мы маем надзею на рэалізацыю нашых планаў.

- У лютым пройдзе **інфакампанія** пра віктымблеймінг у сацсетках **«Падтрымаць, не асуджаць»**.
- З 1 па 10 сакавіка правядзем **Тыдзень нулявой дыскрымінацыі**.
- У сакавіку-чэрвені зладзім **адукацыйна-ментарскі курс** для беларус_ак **«Базавы мінімум: навыкі, якія працуюць на цябе»**.
- У красавіку рыхтуем ужо трэці **Форум All Inclusive**, каб абмеркаваць бягучы стан спраў у сферы інклюзіі і як мы можам на яго ўплываць.
- Будзем працягваць нашую **працу з валанцёр_камі**, каб больш моладзі атрымала магчымасць паспрабаваць сябе ў актывізме. **Далучайцеся!**

- На восень ужо задумалі паўтарыць наш улюбёны базавы курс для арганізатар_ак мерапрыемстваў **«Рабі смела!»** у афлайн-фармаце.

- Плануем развіваць і прасоўваць базавы анлайн-курс для самастойнага навучання **«Курс на каштоўнасці»** і нашую **адукацыйную платформу**.

- **У Вільнюсе** штомесяц запланавалі правядзенне цікавых **імпрэзаў для супольнасці**. Далучайцеся да каналу ў Тэлеграме **«Іншы Вільнюс»**, каб не прапусціць анонсы!

- Будзем рыхтаваць новыя выпускі інтэлектуальнай гульні **ІншыКвіз**.

- Таксама на працягу года ў нас запланаваны **выхад розных матэрыялаў** на тэмы роўнасці і недыскрымінацыі як на нашым **сайце**, так і ў **Instagram**, **Telegram** і **TikTok**. Падпісвайцеся на нас, каб не прапусціць карысныя матэрыялы!

# Да сустрэчы на мерапрыемствах і ў анлайн-прасторы!

# ЯК НАС ПАДТРЫМАЦЬ

# Калі вам блізкія нашыя каштоўнасці і падабаецца тое, што мы робім, вы можаце падтрымаць нас рознымі способамі.

# Проста знайдзіце свой!

## Зрабіце данат!

Выдатны спосаб сказаць нам дзякуй — падтрымаць нас разава або штомесячнай падпіскай на любую суму на сайце арганізацыі. А калі вы рэзідэнт_ка Літвы, то штогод вы можаце пераводзіць нам да 1,2% сваіх падаткаў.

## Далучайцеся да валанцёрскай каманды!

У нас магчыма валанцёрыць! Вашыя навыкі могуць дапамагаць прасоўванню роўнасці, інклюзіі і недыскрымінацыі.

## Лайк, каментар, рэпост, падпіска!

Вашыя дзеянні ўплываюць на алгарытмы сацсетак. Праз вашую актыўнасць нашыя публікацыі ўбачыць большая колькасць людзей. Падпісвайцеся на нас у TikTok, Instagram і Telegram.

## Чытайце і дзяліцеся спасылкамі!

На сайце theothersby.org вы можаце знайсці шмат карыснай інфармацыі на тэму роўнасці і інклюзіі.
Не забывайцеся дзяліцца ёй з іншымі!

## Прыходзьце!

Наведвайце нашыя мерапрыемствы самі і прыводзьце знаёмых. Мы ладзім іх для таго, каб свет рабіўся лепшым. А гэта значыць, што калі вы прыходзіце на нашыя мерапрыемствы, то такім чынам дапамагаеце нам мяняць гэты свет!

## Падпішыцеся на навіны!

Так вы не прапусціце новыя анонсы і артыкулы, а мы будзем разумець, што нашая дзейнасць цікавая для вас.
Лісты прыходзяць 1-2 разы на месяц.

## Гаварыце!

Раскажыце пра нашую працу сваім знаёмым. У складаныя часы «сарафаннае радыё» з’яўляецца выдатным спосабам распаўсюджвання інфармацыі!

## Чытайце і дзяліцеся спасылкамі!

На сайце theothersby.org вы можаце знайсці шмат карыснай інфармацыі на тэму роўнасці і інклюзіі.
Не забывайцеся дзяліцца ёй з іншымі!

## Дапамагайце pro bono!

Калі вы маеце крутыя прафесійныя навыкі, якімі хочаце разава дапамагчы нашай арганізацыі, то мы будзем вельмі радыя вашай падтрымцы.

**Дзякуем вам за любую падтрымку і дапамогу! Мы вельмі шануем вас і дзякуючы вам працягваем сваю працу**

# КАНТАКТЫ

экстр.

@theothersby

@inshyja.by

@othervilnius

@quiz.be

іншыЯ
Дазволь Іншым
быць Іншымі

**info@theothersby.org**
**theothersby.org**

**VšĮ «The Others BY»**
Код рэгістрацыі 306096505